Вольная Беларусь

Цэна асобнаго № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м.	За 2 м.	За 3 м.	За 4 м.	За 5 м	За 6 м.	За 7 м.	За 8 м.	За 9 м
1 р.	2 р.	3 р	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаяцца толькі с 1-го числа кожнаго месяца.

Перамена адрэсу—50 коп. Пры зьмені адрэса конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска напісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ня будуць.

На ліставання, перасылку рукапісау і іншыя адказы павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эканамічная і літэратурная.

Год выданьня I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захараўск. 18

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы — 1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 26. 1917 г. Чэцьвер Выходзіць двойчы на тыдзень. 26 кастрычніка 1917 г. № 26.

Совѣтъ Россійской Республики.

Хто цешыцца кемкаю памяцью, той, напэўна, памятае, што у Петраградзі існуе прэдпарлямэнт, або Совѣтъ Республики. Гэты Совѣтъ Республики мае сваім заданням замецяць Установчы Сойм да яго склікаcьня і будзе заменяць Устаноўчы Сойм, калі ён, дзеля тых ці іншых прычын, ня будзе склікан. Гэта вышэйшая расійская інстытуцыя, каторую утварыла «усерасійская дэмакратычная парада» ў Петраградзі і каторая зьяўляецца вышэйшым прэдстаўніцтвам і нават у дзе-якіх выпадках заканадаўчым органом,—пазваляе нам судзіць аб тым, чаго мы маем спадзевацца ад тае установы, каторую яна цяпер заменяе і каторая мае сабрацца ў Маскве або ў Петраградзі. Совѣтъ Республики—гэта роднае дзіця расійскай (маскоўскай) дэмакратыі і чыннасьць яго паказвае усе тыя карты, каторыя будзе трымаць так званы ўсерасійскі Устаноўчы Сойм. Нават больш за гэта, бо да Установчага Сойму трапяць і прэдстаўнікі цэнзавых элемэнтаў і можна будзе думаць, што воля расійскай дэмакратыі не магла, як сьлед, выявіцца, як яна можа выявіцца цяпер, у Совѣтѣ Республики, дзе ёй ніхто ні замінае і нават сам Урад прад ёю адпаведае. Вот і цікава—як-жа ставіцца гэта расійская дэмакратыя да спраў нацыянальных дамаганьняў, да патрэб нідзяржаўных нацый?

Шмат хто песьціў надзею, што дэмакратыя, каторая, у сваіх адозвах да ўсяго сьвету, абдарае усіх чыста усялякімі аўтаноміямі, у першую чаргу, як адтрымае ўладарства, зьверне увагу на сваіх суседзяў,—па украінцаў, беларусаў, і патурбуецца зьнішчыць цяжкую спадшчыну маскоўскага царызму. Усе вуглы на вуліцах, каменяя у бруку, даволі наслухаліся, што расійская дэмакратыя нясе права на самаадзначэнне усім народам і не дазволіць, каб адна нацыя уладала другою. Тым часам, напіс на чырвоным сьцягу ілгаў, абяцанка засталася цацанкай, і расійскі дэмакрат, ласкава пашыраючы сваю добрату на тых, каму яна ні патрэбна і хто фатыгі яе ні патрэбуе, стрэла дэкляраціі беларусаў, украінцаў і інш. у Совѣтѣ Республики крыкам, шыканнем і выскаляннем. А калі расійскай дэмакратыі паказвалі на чырвоны штандар, дык яна тыкала пальцам у пустапарожнае мейсца ды казала: «Пачакайце,—вось будзе Установчы Сойм!..»

Мы ніколі не пакладалі надзей на маскоўскую дэмакратыю, мы не чакалі падмогі ад расійскіх сацыялістаў і заўсюды клікалі парваць зносіны с тымі, хто сам сабе парадзіць ня можа. Мы заўсюды казалі, што маскоўскі сацыяліст цяжка хвор на самадзяржаўны цэнтралізм і што там, на Маскоўшчыні, разбой, анархія і нісцалёнае разгільдзяйства. Хворага трэба лячыць, але перш забезпечыўшы сябе ад заразы. І цяпер, поўныя веры у творчую сілу свае нацыі, мы зьвяртаемся да сваіх чытачоў, прыхільнікаў і спагадачоў ды кажам: хіба вы не ведаеце, што наш край пазбаўлен свайго права у сваёй хаці і ня зможа паслаць да Установчага Сойму таго, каго-б ён хацеў паслаць? Хіба вы ня бачыце, што ў нашай хаці пануе маскаль-цэнтраліст, каторы, абвязаўшы свой твар чырвонаю хусткай, пройдзе ад нас і да Установчага Сойму? І працаваць ён там будзе ні для нас, ні на карысьць тае нацыі, коштам каторае гадуецца. Хіба мала вам прыкладаў з нашымі меськімі думамі? Пара кінуць вясьці кямпанейства з безнадзейна нядужым і заразьліва хворым: настаў час упэўніцца, што там Масква ня дасьць нам палёгкі. Наша будучына у нашых руках, і наш Установчы Сойм павінен быць на нашай слаўнай Беларускай зямлі. Продкі нашы заўсюды цураліся Масквы і змагаліся з ёю і наказалі нам жыць сваім уласным беларускім жыцьцём, справуючыся праз свой беларускі Краёвы Парлямэнт.

Я. Л—к.

Кроніка Вялікаго Княства Літоўскаго.

Шмат чаго вучыцца, ведае і стараецца пазнаць наш беларус-інтэлігент, але пры ўсім гэтым найменей, бадай, ведае аб тым, што датычэ яго роднай гісторыі, аб тым, як жылі яго дзяды-прадзеды, што дзеялося на зямлі Беларускай

«...У даўные гады;
Што думалі, чаго бажалі мы тады,
За што змагаліся, як баранілі веру...»

Праўда, няўмецтва гэтае нашай інтэлігенціі, крыху апраўдываюць варункі, у якіх жыў праз два апошнія сталецьця наш народ: з аднэй стараны атступніцтва беларускай буржуазіі у старану пануючых культур ды паняволеньне ў прыгоне селян, зруйнавало старую белярускую культуру, панівэчыло нацыянальна-беларускія традыціі, стварыло атмосфэру безпрасьветнага рабства—духа і цела, а з другой стараны розныя забароны, як напрыклад: забарона друку, забарона навучаньня граматы па беларуску, забарона маліцца беларусам у роднай мове стаўлючыя беларуса у палажэньне безпраўнага парыя на зямлі, палітай крывёй і ўгноенай касьцямі дзядоў і прадзедоў.

Але цяпер часьць найгоршай злыбеды нашай мінулася: беларус, як і ўсе людзі, цяпер мае развязаныя рукі і аткрытую дарогу да самапазнаньня і можэ перэтварацца з векавечнага пакутніка у чэлавека-грамадзяніна. Можэ гаварыць голасна у сваёй мові аб сваіх крыўдах і патрэбах, можэ дабівацца сабе лепшай будучыны, можэ пазнаваць мінулае. «Усю праўду пра наш і прошлы час».

Да такіх каштоўных прац, якія з'явіліся у апошніе часы, у першы чарод трэба палічыць перадрук у аднэй кнізе усіх вядомых дагэтуль кронік Вялікаго Княства Літоўскаго. [«Полное собраніе Русскихъ Лѣтописей» Томъ 17-й. «Западно-русскія лѣтописи]. Як усім вядома, колішняе Вялікае Княства Літоўскае упраўлялося, ад мала да вяліка, мовай беларускай і дзеля гэтага Кронікі, так званыя «Літоўскіе», гэта кронікі гасударства, каторае культурай літэратурай і строем было беларускае, само сабой пісаны мовай беларускай. Аўтары гэтых кронік «думалі» па беларуску, і пісалі такой чыстай і харошай мовай, што не адзін с сучасных нашых пісьменнікаў мог-бы пазавідываць прыгажасьці мовы, уложэнай у кроніку, аўторам, жыўшым таму лет 200—300.

Але ня ў гэтым ўся цэна кронік. Кронікі гэтыя даюць пазнаньне гісторыі нашага народу с тых часоў, калі народ гэты жыў поўнасьцю жыцьця, калі яшчэ вогнік рэнэгацтва не чапіў буржуазных слаёў і калі яшчэ народу вальней дыхалося.

Кніга гэта, выпушчэна друкам «Імператорской Археографіческой Комісіей», займае 648 страніц друку ў цэлы аркуш, а ў канцы дададзены два спіскі: спісак імён і спісак мейсцовасьцей, успомненых у кроніках.

Даючы вестку аб кнізе, маю надзею зацікавіць і зьвярнуць на яе увагу людзей, каторыя цікавюцца гісторыей Беларусі.

У кнізе памешчаны такія кронікі: 1] Супрасльскі спісак, 2] Увароўскі спісак, 3] Акадэмічны спісак, 4] Спісак гр. Красінскаго, 5] Літоўскаму роду пачынак, 7] Origo regis Jagyelo et Wytholdi ducum Lithuani. 8] Спісак археологіческаго обшчэства, 9] Спісак гр. Рачынскаго, 10] Евреіноўскі спісак, 11] Родасловіе вялікіх князёў Літоўскаго княжэства, 12] Похвала Вітоўту, 13] Спісак Быхоўца. Да гэтага прыложэна ешчэ: 1) Літоўскаму роду почынак, 2) Родасловец велікіх князей літоўскіх, 3) Начало гасударэй літоўскіх, 4) Предсловіе о вялікіх князях Літоўскіх аткуль яны пашлі, 5) Родаслоўе вялікіх князей літоўскіх, 6) Сказаньне а вялікім князю Вітоўце.

(Перадрук з «Н. Н.»)

Пытаньне на часі.

У бібліотэках, што ёсьць на Беларусі, як у гарадзкіх публічных. так і ў сельскіх народных і ў школьных, блізка што саўсім німа кніг пра Беларусь, не кажучы ужо пра творы беларускіх пісьменнікаў. Трэба было-б закрануць гэтое пытаньне у «Вольнай Беларусі», зьвертаючы на яго увагу гаспадароў і кіраўнічных бібліотэк на Беларусі. А што датычэ бібліотэк школьных, то можэ-б Беларуская Цэнтральная Рада, бяручы прыклад з Украінцаў, зьвярнулася-б з адозвай да інспэктароў ці земстваў, каб у школьныя бібліатэкі і чытальні на Беларусі выпісываліся творы беларускіх пісьменнікаў і кнігі на агульна-рэспубліканскай мові па гісторыі, этнографіі, мові беларусаў і інш, так сама белярускія тэатральныя творы, песьні з нотамі, журналы і газэты. Потым, трэба было-б адзначыць, што беларусы у войску маюць права трэбаваць выпіскі па казённыя грошы у палкавыя і інш. бібліотэкі беларускіх часопісаў, а калі іх у тым не здавольняць, то каб жаліліся у Бел. Цэнтр. Раду.

Нарэканьня па тое, што у бібліотэках, істнуючых на Беларусі, дарма шукаць беларускіх і пра Беларусь у іншых мовах кніг, можна пачуць ня толькі ад беларусаў, але хоць бы і ад жыдоў і заўсёды і усюды ад вучняў, асабліва сярэдние школы.

Дык спадзяюся, што калі пачнецца пісаць аб гэтым у газэці, Цэнтр. Бел. Рада зьверня на гэта належную увагу і можа нават разашле у бібліотэкі гарадзкія і мястэчковыя публічныя і ў школьныя спісак найпатрэбнейшых твораў.

Апроч кніг беларускіх, у бібліотэках на Беларусі канешне павінны быць кнігі па беларускай этнаграфіі [Шэйна, Нікіфороўскага, Романова, Безсонава, Батюшкова, Без-Корніловіча, Карскага і др.], зборнікі беларускіх песьняў, казак, легэнд і т. д., а так сама розныя гістарычныя акты, археографічныя зборнікі і інш., слоўнікі Носовіча, лекцыі Шахматова, Флорынскага і др., па гісторыі славянскіх моваў і т. д.

Апрацаваць гэткі сьпісак можна коллектыўна, а то дык і адналічна.

Праўда, шмат с памянёных кніжак лічуцца у Расіі, як бібліографічна-рэдкія і дорага каштуюць, але, мне думаіцца, што яны ёсьць ці ў Петраградзі ці на Беларусі па губэрнскіх гарадох у грудах на вышках, альбо ў прыватных асоб. То ці ня можна напісаць у газэці, каб хто мае іх і можэ падараваць роднаму краю, каб прысылалі ў Мінск да Рады ці што,—гэтак бы мы распачлі будаванне хоць аднае нацыанальнай бібліотэкі, у якой было-б усё, што калі друкавалася пра Беларусь.

Мне здаецца яшчэ, што творачы сваю Раду, мы занадта «лойяльны»... Калі «явочный порядок» мажліў у фіннаў і украінцаў, то чаго-ж мы чакаімся? Беларус—родны брат, як масковец і украінец, дык чаму наша Рада не маіць такіх жэ правоў, як Украінская? І чаму яна гэткая нясьмелая, што дагэтуль не разаслала па Беларусі ні аднэй паперачкі, як маючая уладу, ну, хаця-ж бы аб бібліатэках?

М. Г.

Лісты с Петраграду.

(Ад нашага карэспадэнта).

II.

„Самаадзначэньне народаў“.

Як ведама, расійская рэвалюцыя парушыла нацыанальнае пытаньне, выгаласіла прынцып самаадзначэньня народаў. Памятаю, якім былі мы усе напоўнены энтузіазмам і радасьцяй у першыя дні рэвалюцыі. Тагды нам сапраўды здавалася, што вот мы пакончылі з абрыдзяўшым нам старым жыцьцём, паставілі над ім крыжык і пачынаем новую пекную страніцу гісторыі. Тагды уся наша жыцьцёвая практычнасьць неяк забылася і моцна тагды верылося ў шчырасьць і дабрату людзей. Так мы верылі і так мы спадзеваліся. Але хутка надзеі нашы былі аплёваны і ўтоптаны ў балота. Даляй голай фразы справа не пайшла. Выгаласілі пекную формулу, выкінулі штандар с пекным напісам і... супакоіліся. Пацешыліся і кінулі надаеўшую цацку. А для нас, недзяржаўных нацый, справа ішла ня толькі аб пекных лёзунгах, але аб нашым жыцьці і нашай сьмерці. Мы не маглі так жыва нацешыцца пекнымі славамі, «права народаў на самаадзначэньне» і кінуць іх. Наадварот, ідэя гэтая расла і крэпла сярод нас. Многа-

мільённыя народы, стогнам стагнаўшыя праз цэлыя вякі царскага панаваньня, не маглі здаволіцца аднымі пекнымі абстрактнымі формуламі. Ім патрэбна было праўдзівае лекарство, якое-б прагнало смагу і залячыло болькі ад царскага самаўладзтва. Нацыанальны рух выбухнуў з новаю, неспадзяванаю сілаю. Пачаліся пробы спраўдзіць, правясьці ў жыцьцё даўно насьпеўшыя патрэбы, якія былі санкцыянованы выгалашанай у часы рэвалюцыі формулай самаадзначэньня народаў. Пачалі расьці, як грыбы, нацыанальныя арганізацыі, пачалі яны гатавацца да будаваньня новага жыцьця.

І вось тут прыйшлося спаткацца са старай праўдай, што словы—гэта адно, а справа—гэта другое. Рэвалюцыйны Урад Расійскай Рэспублікі ня йшоў на сутрэч насьпеўшым патрэбам недзяржаўных нацый, але ўсякімі спосабамі стараўся увільнуць, ухіліцца ад адказу, а калі бываў прыпёрты да сьцяны, стараўся даць як мага меньш, таргаваўся з усіх сіл, як старая таргоўка на рынку. На усё ён меў гатовы адказ: «Цяпер у нас вайна, цяпер не час займацца грунтоўнаю ломкаю вякамі зложанага укладу жыцьця, не час займацца перабудаваньнем Расіі, калі непрыяцель ломіцца ў дзьверы. Трэба спачатку супольнымі сіламі адкінуць ворага, а тагды мы парахуемся».

Так то яно так, але калі рабілі рэвалюцыю, ніхто ня думаў, што цяпер ні час займацца грунтоўнай ломкаю. Ламалі, бо даляй у гэтым укладзі было немагчыма жыць, бо людзі ў ім задыхаліся. Чаму-ж там было можна, а тут раптам—не? Чаму там было на часі, а тут не на часі? Чаму урад не падумае аб тым, што калі пасылаць людзей на бітву, калі вымагаць ад іх найбольшай ахвяры, якую яны могуць даць, ахвяры жыцьця,—дык трэба сказаць ім аб мэці, дзеля каторай яны павінны ахвяровываць сваё жыцьцё; трэба, каб гэтая мэта была варта той страшнай ахвяры, якая за ие вымагаецца. Даўней недзяржаўныя нацыі Расіі, падганяемыя казацкімі нагайкамі, ішлі ваеваць за веру і за цара. А цяпер за што ім ісьці? Можа, за Керэнскага? Можа, «за великую, недѣлимую Россію», за права насіць і надалей ярмо уціску, зьдзеку, цяняверкі і русіфікатарства? Чаму нічога не гаворыцца аб далейшай долі народаў, якія населяюць Расію? Чаму нічога не гаворыцца аб тым, што правы недзяржаўных нацый цяпер ня будуць так таптацца у гразь, як гэта было за царом? Чаму нічога не гаворыцца аб пэўных гарантіях, што гэтага больш ня будзя?..

Адной абецанкі: «Парахуемся насьля» нам мала. Трэба быць пэўнымі, што нас на гэты раз не ашукаюць, як ужо ні раз ашуквалі. Ахвяр ад нас вымагаюць вялікіх, а аб тым, што мы атрымаем за іх,—маўчок. Нават самая формула самаадзначэньня народаў неяк шчэзла ужо з памяці рускіх (вялікарускіх) людзей: нешта ня чуваць яе, нешта выйшла яна з рахунку. Формула гэтая была добрая і харошая тагды, як яе меркаю думалі вымераць Нямеччыну і Аўстрыю, калі думалі аб тым, як «самаадзначыць» Чэхію, Босьнію, Трансільванію, Трэнціно, Познань, Галіцыю... Нават «Новое Время» тагды сьпевала гымны новай формулі, складала хвалебныя дыфірамбы расійскай рэвалюцыі. Але, калі прыйшлося «самаадзначыць» Польшу і калі на чаргу дня стало пытаньне аб долі Літвы, Украіны, Беларусі, Фінляндзіі, Латвіі, Грузіі, Арменіі і т. д., калі прыйшлося падумаць аб іх «самаадзначэньні»,—харастоо новай формулы утраціло сваю даўнейшую вагу ў вачах рускіх людзей.

Разуменне «великой единой матушки-Россіи» «от Финских хладных скал до пламенной Колхиды», разуменне, з якім яны зжыліся ад самага свайго дзяцінства, аніяк не ўкладалося ў галаве разам з нейкімі там аўтаноміямі нейкіх хахлоў, каторыя ядуць галушкі, пінскіх лапацонаў, што ходзяць с калтуном на галаве, і нейкіх ужо зусім нячуваных літоўцаў, эстонцаў і «міфічных летгальцаў» *).

Урад не клапоціцца аб напаўненьні абстрактнай формулы самаадзначэньня народаў якім-небудзь рэальным зьместам, а ўсе «истинно русскіе» людзі стараюцца як-небудзь схаваць, засунуць як мага даляй і самую ненавісную цяпер ім формулу...

Але «шыла ў торбі не схаваеш,»—яно ўсё-ж такі вылазіць наверх на злосьць і рускім людзям і рускім газэтам. Лямантуюдь цяпер яны, аж страх, злуюць на «ніпамеркоўныя трэбаваньня» нідзяржаўных народаў. Як гэта можа быць, каб якія-сь там «хахлы» маглі трэбаваць, каб вучэньне ў школах, альбо царкоўная служба адбываліся ў іх па-хахлацку? Гэтага-ж быць ні можа і не павінна!..

*) Як выслявілася вячэрняя газэта «Русская Воля» № 235.

І чаго-чаго толькі буржуазна-расійскі друк ні гаворэ аб нідзяржаўных расійскіх народах? Якім толькі брудам ні стараецца абліць іх нацыанальныя ідэалы? Дзеля прыкладу, перапішу некалькі радкоў з газэты «Русская Воля» [вячэрні выпуск, № 235], гдзе грамадзянін Борух Гіршэвіч Міркін-Гецэвіч [падпісываецца: Борис Мирскій], ўзяўшы на сябе роль абаронца вялікарасійскага нацыанализму, так піша аб прамовах прэдстаўнікаў нацыанальнасьцей на Дэмакратычнай Парадзі:

«... Однако самое тягостное и поистинѣ трагическое впечатлѣніе производят не большевики, а представители національностей. Характерно: всѣ эти великодержавные агенты малых народностей выступают только с требованіями. Они не просят, они не жалуются,—они требуют... «Мы требуем от Временнаго Правительства»—вот почти шаблонное начало всѣх косноязычных декларацый національных представителей...» «...всѣ эти латыши, эстонцы, литовцы, украинцы, латгальцы [есть и такіе] назойливо выступают вперед и только требуют, требуют и требуют...» «...читая шершавыя рѣчи всѣх этих инородческих завоевателей, читая их требованія, их вопли о правах, без единаго указанія на обязанности, невольно подумаеш, что это не представители Россіи съѣхались,—а полувраждебныя государства послали своих делегатов на предмет объявленія Россіи войны...»

«...И вот вылѣзает какой то украинскій «представитель» и начинает требовать, требовать, требовать...»

Вот як піша расійскі нацыаналіст с Палясьціны аб украінцах, беларусах, літоўцах, эстонцах і т. д., каторыя складаюць больш, чым палавіну Расіі. І яго словы знайходзяць водгук у расійскім сэрцы.

З гэтага відаць, што надта пакладацца на расійцаў ні можна. Расія на краю пагібялі свае, Расія гіне, а расійскія нацыаналісты, як з Яраслаўскай і іншых губэрняў, так і с Палясьціны ні толькі што ні хочуць пазбыцца панаваньня над іншымі нідзяржаўнымі нацыямі, але яшчэ хочуць заставіць іх ісьці уміраць за вялікадзяржаўныя апэтыты маскоўскіх нацыаналістаў і прыстаўшых да іх пялясьцінскіх перавертняў. І яны яшчэ дзівяцца, калі нідзяржаўныя народы ня выказываюць ахвоты ісьці на сьмерць дзеля таго, каб абараніць права далейшаго нашэньня маскоўскага ярма на сваёй шыі...

Нідзяржаўныя народы ўжо не мала паклалі свае працы і пралілі свае крыві над падтрыманьнем цэласьці і дабрыту Расіі. Палавіна нашай маткі-Беларусі спустошэна вайною, сотні тысяч дзяцей яе на выгнаньні ў чужыні, сотні тысяч сыноў яе сядзяць у акопах і бароняць... каго і за што? Павінны ж яны пачуць, што яны кладуць сваё жыцьцё ні толькі дзеля чужых мэтаў, але й за свае ўласныя. Трэба, каб у іх было за што ваеваць і што абараняць.

Бо іначай... гора Расіі!

П. К.

4/х 1917 г.

З Румынскага фронту.

Мерны стук вагонных калёс заціх, як бы іх шум праглынула ціш гэтай цёмнай ночы. Машына стала, а з ёю застанавіліся і тыя нашы думкі, с каторымі мы ехалі, застанавілося і жыцьцё сэрца, каторым білося яно да гэтуль. Што нас чакае? Што нясе нам блізшы мамэнт?

Далей ехаць некуды. Мы дайшлі да тэй граніцы, да таго этапу нашага жыцьця, дзе нам нейчая воля напісала: «Стойце! Тут—паварот. А куды? Не вам гэта ведаць.» Як нідзе, як ніколі, чуеш тут, што ты—лёганькі пыл, маленькая пушынка ў калавароці віхроў. І пакорна складаеш свае «вольныя» крыльля, увесь аддаючыся ў абладу неадваротнай долі.

Мы выйшлі з вагонаў. Трывожная ноч ахапіла гэты чужы нам край. На бяздонным небі мігацелі далёкія ясныя зоры, і нейкі спакой сходзіў ад іх па зямлю, на тую зямлю, каторая ужо чаць-

Сымон музыка.

(Глядз. № 25)

Расказаў, дзе ён радзіўся,
Як ён жыў і чым ён жыў,
Як і с кім калі здружыўся,
Чым ён сэрцэ весяліў.
Аб усім казаў праўдзіва,
Проста, здатна ён казаў,
Усе спаміны свае жыва
Вольным словам маляваў,
І абразы за абразам
Шлі, уставалі с туманоў
Здольным сумным-сумным сказам
Ткаліся згодна, клаліся разам,
Як часамі з аблакоў
Тчэцца хмара дажджэвая...
Ганна слухала той сказ
Пільна, вочак не спушчая,
Хоць парушылась бы з раз.
— Ой, Сымонка, як цікава!
Ну ж, і гора ты зазнаў!
Кажэ дзеўчынка ласкава:
— Ты ўсё жыцьця гараваў.
Ці то ўжо такім радзіўся,
Ці табе так Бог судзіў,
Каб пакутаваў, нудзіўся,
І як пракляты хадзіў.
— Не, не, Ганна залатая!
Ласкаў Бог і на мяне:
І мне радасьць пасылае
У сьпевах ночкі, цішыне...
От паслухай:
«То неўдалы
Нехлемяжы быў дубок,
Сярод траў, ў глушы запалы,
І пахілены на бок.
Хто быў дужшы і праворны,
Той грунт лепшы карыстаў,
Для таго быў сьвет прасторны,
А слабейшы і пакорны
Толькі жыцьце марнаваў.
Усе дубэ расьлі, таўшчалі,
А закіданы дубок
За нівошта зьневажалі,
І ён быў там адзінок,
Зьмізарнелы і адметны,
Для другіх дубоў чужы,
З ім быў кожны непрыветны,
Як той камень на мяжы.
Збоку глянуць, ўсім здавалось
Што дубок той крападаў,
Што з яго трава сьмеялась,
Што дарма ён грунт займаў.
Так другія разважалі.
А што думаў сам бедак,
То таго яны не знаалі
Не дагадваліська ніяк.
А у яго быў кут багаты
Усякіх думак, сьпеву, сноў,
Казэк вугал непачаты,
З ім размову вецяр вёў,
І яму сьмеяліська хмаркі
Ды віталіська моўчкі з ім,
Плывучы ў адзеньні яркім,
Тканым сонцэм залатым.
З ім усё лета, дзень і ночку
Булькаў сьветлы ручаёк,
А з лясоў, с палёў дубочку
Нёс навіны матылёк.
А ён слухаў, сам маркотны,
Усіх гатовы падтрымаць
І палёгку ўсім гаротным
Як і сам ён, хацеў даць,
Каб ўсе чыста былі рады,
Каб ніхто не гараваў,
І каб крыўды, ліха, здрады
Больш ніхто не зазнаваў,
Углыбіўшысь ў думкі сьвета
Зьліўшысь з гэтым усім жыцьцём,
У горкі жаль яго адзеты,
Ен зрабіўся песьняром.
І сьпеваў ён так прыўдало
У час, як сьвет сапачываў
Што аж цеба усё дрыжачо,
І зямля ўся замірала,
І дух згоды ахінаў
Тагды усё яго стварэньня,
І ўсё слухало той сьпеў.
Чэзло здраднае насеньне,
Пераходзіў ў радасьць гнеў,
Ажывала ноч глухая,
Зноў займаўся ясны дзень...
Здрыганулась сіла злая,
Чуе—кепска: згіне цень.
Сьціхла песьня—цёмна стала
Ураз пагасьлі ўсе агне,
І сякера заблішчала
Пры дубовым каране.
Ссеклі злыдні дзіва-дрэва,
Сэрца вынялі з яго,
Каб ня чулі ночы сьпеву
Найдзіўнейшага таго;
А дубок бяз сэрцавіны
Злосна кінулі на дол.
Змоўклі песьні с тэй часіны,
Сумна стала навакол,
Толькі зрэдка, на сьвітаньні
Як ўздымаўся вецярок,
Чуліська журба і стагнаньня—
Плакаў ссечаны дубок.
Шоў тым мейсцам падарожны
І сьпыніўся: чуе ён—
Не то голас чый прыветны,
Не то струн балючы звон:
Агляну́ўся—нікагутка,
Бліжэй к дзераву ступіў—
Што за дзіва? Што за чутка?
Дуб жалобна галасіў,
Як бы скаргу слаў да Бога
Ці на долю нарэкаў...
Падарожны з дуба тога
Дудку жыва змайстраваў.
І пашоў у сьвет ён Божы
З гэтай дудкай жабраваць,
Ды ўжо не так прыгожа
Гэта дудка стала граць,
Бо ня тое на ёй гралі,
Чым душа ае жыла
Бо дар у ёй тамавалі,
Бо нявольніцай была.
І нудзілась дудка тая
Усё аб родных каранёх,
Аб праўдзівых песьнях края,
Мілым лузі і палёх.
Толькі ж раз яна пачула
Родны воклік, родны зык,:
Воля, ласка ёй вярнула
Злымі выняты язык.
І за момэнт ласкі, волі
Усё гатова дараваць,
І за гэта сваю долю
Стала дудка выслаўляць.
А як волю ўсю пачуе,
Зноў, як колісь, ажыве,
І зноў песьня запануе,
У сьвет далёка паплыве.
А на тых яе карэньнях
Дрэвы новыя ўзрастуць
І другому пакаленьню
Яе песьню дапяюць.»

Скончыў хлопчык казку гора,
І галоўку пахінуў,
Зноў Сымонку, як учора
Жаль вялікі агарнуў.
Ганна слоўка не ўраніла,
Уся замёрла, як і ён.
Бы жуда іх ахапіла,
Надышла з усіх старон.
І зьнячэўку Ганна ўстала,
Усім надхнулася нутром
У твар яго пацалавала
Крэпка-крэпка! І прапала
Дзесь ў саду за вішняком.

На усходзі чырвань грала,
Цень зьбегала, нікнуў змрок,
І зямля ужо вітала
Новы радасны дзянёк.
[Канец другой часьці]

Якуб Колас.

Лістон і надзея.

Высока-высока.
На дрэва галінцы,
Дрыжэў адзінока
Лісток на вярбінцы,—
Маленькі, зжаўцелы,
Ледзь-ледзь ён трымаўся,
Баязна, нясьмела,
Усьцяж калыхаўся...
І неяк нат крыва
З галінкі вісеў,
І ветру парываў
Лісток ніхацеў...

Глыбока—глыбока,
Бо ў душы аж недзе,
Дзе людзкае вока
Ужо ні загледзе,
Апошня надзея
Жыла ў чалавеку
На лепшыя дзеі
У гэнашнім веку...
Слабенка—слабенка
Трымалася сэрца,—
Ен сам нат ціхенка
Адкрыць свае дзьверцы
Прад злосьцяю сьвету
Баяўся, ня сьмеў,
Надзею каб гэту,
Каб віхар ня зьмёў...

Ды восяні познай
Насталі дзянёчкі,
І сумнасцяй грознай

вёрты год ні ведае супакою.

Есьць сваё асобнае жыцьце, сваё хараство, грознае і жудаснае, у гэтых нівядомых палёх, дзе сышліся народы для выражэння сваёй злой волі. Яны ні змаглі памеркавацца, ні змаглі падзяліць свае інтарэсы, сваё права. Спачывалі на кароткі мамэнт гэтыя аўтары ахвяр людзкога збойства, людзкіх цёмных сілаў, каторыя спрадвеку налажылі абладу на чалавека; спачывалі яны, гэтыя могілкі ўсесьветнай калатні і трасяніны. Але сапачынак іх быў ня доўгі, прарывісты, пудлівы, трывожны. То там, то сям с тых даляў, на каторыя апіралося гэта прыветнае і спакойнае неба, вынікалі дрыготныя бляскі ракетаў. Бледны іх сьвет дрыжаў, калыхаўся, трэпетаў, бы матылёк, садзючыся на краску. І здавалося, што нейкаму богу вайны залящела у вочы мошка, і ён моргаў сваімі агнявістымі зрэнкамі. Вось замігацела зарніца. Ноч скалыхнулася сваімі чорнымі крыльлямі і заспакоілася, а сьледам за гэтым бухнула гармата, цяжка і злосна. Узгоркі і лаге падхапілі гэты гук, перакідаючы яго ўсё далей і далей, аж покі ён не загубіўся ў невядомых цемрах.

Са станцыі мы пашлі у румынскі гарадок, тут жэ нідалёка, і адразу папалі у тую бязталковіцу, каторую так багата наша Расія. Мы доўга блуталіся па незнаёмых вуліцах, забегалі у дварэ, падымалі сонных румынаў, каб распытаць у іх дарогу. Румыны нічога не цямілі у нашэй гаворцы, хоць старання памагчы нам у іх было многа. Мы пыталі у іх па сваёму, а яны па сваёму адказывалі нам, тлумачылі доўга, паказывалі і два і тры пальцы.

— Эй, руманэшт!—зьвяртаўся да румына наш салдат:—уні ест тут этапны камэндант?

— Камэндант! камэндант!—хапаўся румын за гэта адно знаёмае слова і пачынаў тлумачыць.

— Дык дзе ж ён, дзе?—насядаў салдат:—ідзі, пакажы!

Румын ішоў з намі колькі крокаў. Спыніўшыся, зноў пачынаў тлумачыць.

— Эх, які бязмозгі румынэшт!—цярпенне у салдата лопало, і ён ўрэшці ня вытрымаў.

— А прападзі ты пропадам! Чорт цябе ведае, што ты лапочаш! Заехаць бы табе па карку, можэ б паразумнеў.

Румын здаволяна і весела ківаў галавою, думаючы, што ў канцы ўсё ж такі давёў нас да розуму.

Тым часам пачынало сьветаць. Бледна-ясныя стрэлы яшчэ ні выплыўшага з за узгоркаў сонейка разліліся па усходзі і падымаліся ўсё вышэй і вышэй. Прохладзь раніцы павеяла на землю і ціха скалыхнуліся лісьця высокіх акацыяў. І чулася у іх шэляху шчасьлівае пракананьне таго, што цёмная ноч дае мейсцэ сьветламу дню. Прыгожы шчыток, вытканны з белае воўны лёгкіх хмарак, ужо абсеіваўся золатам праменняў, і ціхая радасьць разлівалася па твару зямлі. Зачаўся дзень.

Чуць толькі ўзышло сонейко, пайшлі другія малюнкі, другія зьявы. Вот дзесь то пачуўся мала знаёмы для вуха свежага чалавека гул, магутны, роўны, даволі прыемны для слуху. Падымаем вочы у гору—нівысока у воздусі плаўна нясецца аэраплян, шыбуючыся у бок нямецкіх пазыцый і забіраючы ўсё вышэй і вышэй. Праз некаторы час з нямецкага боку забухалі гарматы, і цёмныя дымке узрывоў, як невялічкія хмаркі, плывуць вакруг аэрапляна, вынікаючы то вышэй, то ніжэй, то далёка з боку. Клубке цёмнага дыму доўга стаяць у небі і ніахвотна расплываюцца у воздусі. Праз колькі мінут высока-высока паказываюцца нямецкія машыны. Як каршунэ, выглядаюць свой пажытак. Такім жэ парадкам сустрэкаюць і у нас гэтых нязваных гасьцей. Зноў грымяць гарматы, зноў вынікаюць у небі светлыя дымкі ад нашых снарадоў. А пазыцыі тым часам ажываюць, там пачынаецца штодзенная работа зніштажэньня адных другімі. Загулі гарматы на розныя галасэ. Адны грукалі сярдзіта, адрывіста і глуха, бы той упарты баран у сьцену загарадкі, а другія бумкалі з нейкім здушэным звонам, і ад іх стуку балела ў вушах; трэція бахалі, як у кадзь, абернутую дном у ваду, а некаторыя грымелі доўга і працяжна, точ ў точ як далёкі гром. Усе-ж разам рабілі яны некае дзікае ігрышчэ, даўшы поўную волю сваёй прагавітасьці да людзкой крыві. І тым ня меней здалёк у гэтым рэву гармат ёсць нейкае хараство, і ў ём чуецца сіла і магутнасьць, каторымі напоўняецца і садрыгаецца воздух і зямля, тая сьляпая сіла разбурэння, каторая ня ведае ні граніц, ні утрыманьня.

А небо такое пагоднае, прыветнае, яснае! Сэнейка шчыра залівае гарачымі стрэламі гэтыя неспакойныя далі. У воздусі пыл, духата, ад каторых некуды схавацца. За горадам, у бок пазыцыяў. высока ў небі, нерухома вісіць прывязаны шар. Здалёк ён выглядае так, як бы які-небудзь сьвяты [даруй Божэ грэх] вывесіў сушыць на сонцы свае порткі. З гэтага шару вядуцца позіркі за тым, што робіцца у ворагоў.

Вечэр паволі абнімае землю, і ціш заходзе на горы і даліны. Пазыцыі заціхаюць і толькі дрыготныя пужлівыя агне пачынаюць ізноў вынікаць над гэтымі далямі сьмерці. Захад доўга купаецца і гарыць у жоўта-чырвонай пазалоці і пазірае нейкаю зловешчай і крывавай мараю. Збоку на небі, над тымі разлогамі, дзе увесь дзень грымелі гарматы, пачала вынікаць продаўгаватая палавая хмарка. Цёмна-сівыя клубочкі яе борзда разнімаюцца па канцох, а на гэтай хмарцы, як на падмуроўку, сталі выяўляцца новыя клубочкі. Вот з аднаго і другога канца хмаркі ціха выходзяць дзьве хмаркі-ўздушыны, разварочываюцца, большаюць, распускаюцца ў самавітыя фігуркі, прыймаючы ўсё ясьнейшыя і ясьнейшыя формы і абрысы. Ешчэ момэнт—дзьве чалавечыя фігуры, як вылітыя. Адна маладая кабета с пышнаю галавою, але гэта галава ўсё нікне і нікне, спускаецца на грудзі, твар хаваецца, і толькі адна задуманная постаць, поўная нейкай пакуты, захавала сваю форму. А насупроціў, разам з гэтым, вынікае высока задзёртая здаволеная, назойлівая, скалазубая мужчынская галава... Колькі мамэнтаў дзьве гэтыя фігуры застаюцца яркімі, чоткімі. Але гэта чароўнасьць вячорных хмарак прападае, і трывожная ноч ўсё засьцілае змрокам.

Якуб Колас.

II-я сэсія Цэнтральнае Рады Беларускіх Арганізацый.

У нядзелю, 15 кастрычніка, пачалася II сэсія Цэнтральнае Рады Беларускіх Арганізацый. Прыехала шмат прэдстаўнікаў ад ваенных, грамадзянскіх і палітычных беларускіх арганізацый. З усяго адразу пачулося, што у беларускім руху настаў перэлом. Зьмяніліся часы, зьмяніліся думкі і жаданьня беларускага народу. Народ пачынае будзіцца ад цяжкага доўгага сну, народ ужо пачуў сваё беларускае «я.» І вось гэты голас прабуджанага «я» загаманіў на зьездзі вуснамі самога народу, вуснамі яго лепшых сыноў, вуснамі пасланцоў ад арміі і флоту. Мо' першы раз выявілася сіла, якая ёсьць у беларускім руху. Усюды растуць беларускія нацыянальныя грамады, ўсюды лучуцца сыны роднай Маці-Беларусі, каб разам здабыць для яе шчасьце, зямлю і волю. Радасныя для беларускага сэрца весткі аб тым, што сьведамасьць нацыянальная пашыраецца, ні раз вызывалі магутны вокліч з грудзей усіх сабраных: «Ніхай жыве вольная Беларусь!» «Аўтаномная Беларусь у Расійскай Фэдэратыўнай Дэмакратычнай Рэспубліцы!»—вось чаго хочуць беларусы і чаго дамагаюцца. Гэта ясна настаўляна у статутах нават такіх арганізацый, дзе злучаны беларусы с цэлых армій, напр. X, XII.

Арганізацыя беларусаў у войску с кожным днём усё разрастаецца. Ужо сабраўся вайсковы зьезд заходняга фронту у Мінску і, як мы чулі, пастанавіў рабіць беларускія палкі. Беларускае войска—гэта гістарычны мамэнт для Беларусі!

З дакладу кс. Гадлеўскага відаць, што на каталіцкай Беларусі справа стаіць дужа добра: беларуская мова пачынае займаць належнае ёй мейсца у касьцелі. Відаць і тутака пашлі да галавы па розум!

Дзень першы 15.х. 1917 г.

Сэсія пачынаецца прамовою сябра Выканаўчага Камітэту, А. Смоліча, у каторай ён, абрысаваўшы цяперашняе становішча Беларусі, зауважвае, што час вымагае зьеднаньня усіх сіл дзеля абароны свае бацькаўшчыны.

Пасьля яго прамовы, чытаецца сьпісак дэлегатаў, а за тым выбіраецца мандатная камісія з 5-і чалав. дзеля праверкі поўнамоцтва.

У прэзідіум выбраны: за старшыну —Я. Дыло, за таварышаў: Адамовіч і Уласаў, а за сэкрэтароў: Тарашкевіч і

Навіслі і ночкі;
Ды ў цемры вялікай
Пачаліся гулі—
Васеньняй музыкай
То ветры падулі.

Лісточак вярбінкі
Мацней задрыжэў
І з дрэва галінкі
Далоў паляцеў...
Маленкі, зжаўцелы,
Ляжыць у балоці,—
То восяні дзела
Пры цемры рабоці!..

Апошню надзею
У душы чалавека
Зглуміла завея
Бед, гора і зьдзекаў...
І частка душы
Лягла у балоці,
І гіне ў цішы
Пры жыцьця паходзі...

А. Сумны.

Песьня.

За рэчкай, за рэчкай
Шуміць, шуміць бор,—
Прыехаў Ясечка
У панскі у двор...
Цёмны ходзяць хмары
Па небі высокім,—
Ці будзе ён ў пары,
Ці мо—адзінокім?..
Грозна бьюць пяруны,
І зіхціць маланка,—
С конікам-скакунам
Стаў ён каля ганку...
Шуміць навалніца
З неба палавога,—
Вокны ў вакяніцах,
На ганку нікога...
У дьзверы пастукаў
Сільною рукою,—
Толькі пярун грукаў
Недзя за гарою...
Зразумеў нядолю,
Нядолю сваю,—
Неба, плач ты боляй,
Мый чорну зямлю...
Сталася, як людзі—
Суседзі казалі,—
Бура усьцяж гудзе:
Німа яго кралі...
Вывяз бацька дочку
Недзя за граніцу,
Вывяз ў цёмну ночку,—
У буру—навалніцу...
Дык грымі ты, неба,
Сьвяціце ж маланкі,—
Нічога ня трэба
Калі німа Ганкі...
Дык шумі за рэчкай
Бор шумам вялікім,—
Каб зглушыць у Ясечкі
Сэрца болю крыкі!..

А. Сумны.

На плач мяне забірае.

На плач мяне забірае:
На ціхі плач,
Страшэнны плач,
Бяз сілы...
Стаю на распуцьці
У пушчы бязкрэснай,
Шчарнелай, жалобнай,
Замёрлай,—
Бяз крышкі надзеі,
Спаткаці жывое,
Хоць сэрца маё поўна
Вялікім жаданнем:
Ня быці адному,
Кахаць, што ёсьць годна
Кахання людзкога,
Хоць думкі вялікі,
Уселякіх пытаньняў,
А часта і адказу,
Вінуцца, нясуцца,
Быц нейкія хмары,
Што цёплым дажджом
Ня могуць праліцца
На чорную землю...
Так мысьлі адказам
Ясным ня могуць
Сказацца—
На страшны пытання
Жыцьцёвы!..

І моўчкі стаю я
На жыцьця распуцьці,
Усяго баздарожжы...
Бяз сэрца каханьня,
Бяз дум адказаньня,
Бяз сілы жыцьцёвай.
Бяз усякае сілы!..
І бьецца напрасна
У грудзях маіх сэрца,
І рвуцца так думы,
І гасьне душа...
Бо нават ні маю
Я гэнай пацехі,
Каб ў сенкі ці жары
Духоўны—
Хаценьня пытаньня,
Каб высказаць словам,
І кінуць у твар людзям
Страшэнныя праўдай
Магучыя словы...

Усьцяж стаю моўчкі,
У сабе я тамлюся...
І чую што робіцца
Зьдзек мне вялікі,
Вялікая крыўда...
А я ўсёж бяз сілы
Стаю... чую,—боляй
Ды боляй на плач
Мяне забірае...
На ціхі, страшэнны,
На плач бязгалосны,
На плач бязсьлёзны...

А. Сумны.

Родная веска

На пяшчаным касагоры,
Блізка ля руч'я
Відна хораша ў прасторы
Вёсачка мая.
Да дамоў вянок прысады,
Мовіў бы, прыліп,
Што людцы садзілі рады
Ля сваіх сяліб.
Пазіраюць неяк сумна
Стрэхі сумных хат
І раскладзістыя гумна,
Стоючы ўрад.
Вока міла іх вітае,
Угледзіўшы здалёк:—
Тут радзіманька сьвятая,
Родненькі куток.
Тут радзіўся я, тўт вырос,
Быў тут хлапчанём,
Спатыкнуў я тут благі лёс
На жыцьці сваём.
І цяпер ціхая сьлёзка
Коціцца з вачэй,
Як падумаю, дзе вёска
С хатаю маей?..

А. З.

Родная сяліба.

Шырокім пасам нібы,
Пачаўшыся ў палёх,
Шнур роднае сялібы
Праз вёску накрыж лёг.
Будынкамі занята
Уся гэта раўніна:
С каморай стала хата
Пры вуліцы з'даўна.
Напроціў сьвіран новы,
Паветка, стайня, хлеў;
За вуліцай фруктовы
Садок, маўляў, прысеў.
За ім, туж за гарушкай,
Целятнікі відаць,
І рэчка ўецца стужкай
У грэблі мокрай гаць.
А зноў з другога боку
Разселася гумно,
Што, мовіў бы, здалёку
Ад вуліцы відно.
На гумнішчы сахаты
Віднея азярод,
А між хлявоў і хаты
Падворак і гарод.
Апяразаны нібы
Удоўж і ўпапярок
Платамі,—кут сялібы
Паходзіць на астрог.
Аж некалькі варотаў
У платох ёсьць дзе-ня-дзе,
Праз іх між варотаў
Дарога ў даль ідзе.
Пры ёй даўгапольны
Шнурок сялібны лег
І накрыж праз дарогі
Ен цягнецца ў палёх.

23/хі 1916 А. З.

Таварышы і грамадзяне!

На выбарах да Устаноўчага Сойму па Міншчыні

№ 13. галасуйце за сьпісак № 13.

Беларускай Сацыалістычнай Грамады.

Сацыалістычная грамада выстаўляе гэтакіх кандыдатаў:

1] Прушынскі Александр Владзіміраў,—беларускі паэт, адбыў 9 год ссылкі за землю і волю народа. [Мінск, 2-я Мікалаеўск, 6].
2] Петроўскі Базыль Петраў [Масква, Пераведзероўка, 12].—Работнік і літэратор. Родам с Капыля.
3] Лёсік Язэп Юркаў, [Мінск, Захараўск., 18].
4] Жылуновіч Змітрук Тодароў, [Петроград, Знаменская, 36-54.] Работнік, канторшчык. Беларускі пісьменнік. Родам с Капыля.
5] Міхайлоўскі-Рак Сымон Александраў, салдат, X арміі, вучыцель.
6] Мамонька Язэп Алексееў, салдат, XII арміі. Родам са Случчыны.
7] Тарашкевіч Броніслаў Адамаў, [Петроград, Знаменская 36-54] Сын селяніна с-пад Вільні, кандыдат філолёгіі.
8] Турук Тодар Тодароў, [Масква, В.-Лубянка, Зрэценск., 6]. Вучыцель Мінскай гімназіі. Родам з Новагрудчыны.
9] Адамовіч Вячэслаў Антонаў. [Мінск, Міхайлоўская. 21]. Даўнешы рэдактар «Сѣверо-Запад. Телеграфа».
10] Бадунова Палагея Александроўна [Мінск, Захароўск., 18]народн. вучыц.
11] Міцкевіч Канстантын Міхалаў [Якуб Колас] Вядомы паэт Беларусі з Мікалаўшчыны, Мінскага пав. падпаручык 292 Александ. полку.
12] Остроўскі Родаслаў Казіміраў, Слуцк, Камісарыят. Вучыцель с Случчыны, беларускі працаўнік.
13] Смоліч Аркадзі Антонаў. агроном, родам з Бабруйскага павету, беларускі дзеяч.

Даніловіч.

Смоліч прачытаў пратаколы першае сэсіі Рады, каторая адбылася 5-6 жніўня. Прапануецца апрацаваць парадак дня. У гэты час ад мандатнай камісіі паступіла заява, што усіх мандатаў 36 ад 27000 чалав. Парадак дня прымаецца гэтак: 1) Даклад Выканаўчага Камітэту; 2] даклады з мейсц. З дакладу В. Камітэту выяўляецца, што працаваць было трудна—з 9 чалавек В. Камітэту працавало толькі 2. Не было грошай і арганізацыі іх не прысылалі. Уся праца Камітэту абмежавалася прэдстаўніцтвам на розных зьездах. Так, напр., пасылаліся прэдстаўнікі ад Цэнтральнае Рады на Маск. параду, на Зьезд Народаў у Кіеў, на Дэмакратычную параду і зьезд уцякачоў у Маскве. Апрач гэтага заложан мейсцовы камітэт уцякачоў. Дакладчык заклікае ўсіх дапамагаць у працы, дзеля чаго трэба з Расіі пераехаць на службу у Мінск, хоць-бы гэта было і ні так выгодна з матэрьяльнага боку.

У спрэчках па цакладу В. Камітэта дзе-хто выказваў думку, што Мінск мала адпаведае працы, дзеля чаго карысла было-б перанесьці цэнтр чыннасьці у другое мейсца, напр. у Магілёў ці Віцебск, але такая прапазыцыя адкідаецца. Старшыня Я. Дыла [illegible] ...ажа, что вінен тут ні Мінск, а тое, што уся наша інтэлігенцыя працуе у чужых арганізацыях. Беларусы былі пад уплывам расійцаў і палякоў, пад уплывам чужых культур, і усе нашы лепшыя сілы аддавалі сваю працу чужынцам. Да рэвалюцыі нас душылі, а цяпер нападаюць на нас і самыя чырвоныя. Перакінчыкі-беларусы лепшыя расійцы ці палякі, як праўдзівыя расійцы ці палякі. Іншы, адтрымаўшы эдукацыю на бацькаўскія грошы, ня хоча гаварыць з бацькам і бэсьціць усё роднае. У Мінску зем-гусары пазахоплівалі усе пасады, і мы перасталі быць гаспадарамі у сябе дома. Але Мінск і Вільня—цэнтры нашага руху, Вільня павінна быць цэнтрам палітычнага і культурнага жыцьця Беларусі. і цэнтральная Рада павінна покі што заставацца у Мінску. Ніякі іншы горад для нас не падходзіць Магілёў сонны, ціхі горад, Вітэбск—гняздо б. чорнасоценства. У Гомлі «дэмакраты» чуць не пабілі нашага агітатара. Ня лепш і ў Оршы. Мы павінны зрабіць усё ад нас залежнае, каб да нас прылучылася нашае войска і селянства. I гэта будзе!

Посьля Я. Дылы гаварыло яшчэ колькі прамоўцаў і першае пасядзэння у вечар 15 кастрычніка было зачынено.

Апошнія навіны.

Саюзнікі і расійская формула міру.

З Лёндану паведамляюць, што нашы саюзнікі адмовіліся разглядаць тыя умовы міру, якія былі выстаўлены радаю работніцкіх дэпутатаў. Яны кажуць, што сучасны момэнт не адпаведае таму, каб цяпер займацца развагаю тых патрэбаванняў, што прапакованы расійскай дэмакратыяй. Маючая адбыцца ў Парыжу конфэрэнцыя саюзнікаў, будзе разглядаць толькі пытанне аб тым, як ваеваць, а не мірыцца.

Казацтво і фэдэратыўная рэспубліка.

У Уладзікаўказі скончылася конфэрэнцыя прэдстаўнікоў казацкіх войск і горных народаў Каўказу. На конфэрэнцыі падпісан даговор аб утварэнні «Юго-восточнаго саюза казачьихъ войскъ, горцевъ Кавказа и вольныхъ народовъ степи.» Хаўрус ставіць сваім заданнем дабіцца як найхутчэй устанаўлення расійскай фэдэратыўнай рэспублікі с правам для кожнага члену хаўрусу на асобны штат, і міру на аснові самаадзначэння народаў.

Кожны член хаўрусу мае поўную незалежнасьць у сваём ўласным жыцьці. Мейсцам прабывання абвешчанага ураду выбран г. Екатарынадар. У гэты хаўрус увайшлі: казацтво донскае, кубанскае, церскае, астраханскае, народ калмыцкі, усе народы. Дэгестану, Закатальскае акругі, народы церскага, кубанскага краёў, сухумскае акругі, стэпныя народы церскага краю і Стаўропальскае губэрні.

Кароль Польшчы.

З Вены паведамляюць, што 4-га лістапада, у дзень свайго нарадзэньня, імператар Карл мае прыняць важнае настанаўленне датычна Польшчы, Сэрбіі, Босніі і Герцэгавіны. Ен хоча абвесьціць сябе каралём Польшчы.

Новая пазычка.

Урад З.-Амэрыканскіх злучаных штатаў дае Расіі новую пазычку у сумі 31 мільён. 700 тысяч доляроў (у звычайныя часы 1 доляр каштаваў 2.50 к.)

Вайна.

Паўночны, заходны, паўднёва-заходны і румынскі фронты—стрэляніна і выведы. Каўказкі фронт. На Кемахскім напрамку нашы часьці выбілі туркаў з акопаў і адкінулі іх да Келахі

На Чаўнінскім напрамку ў районі Огнут нашы разведчыкі зьбілі турэцкую варту.

Балтыйскае морэ без перамен.

Від Військового Генерального Комітету

ГРОМАДЗЯНЕ УКРАІНЦІ!

20-го Жовтня відбудеться 3-ій Всеукраінський Військовий з'їзд. Незвичайно важливий момент для передачи через живі руки агітаційноі й просвітньоі літератури на фронті і в тил в глибину Украінськоі воицькоі маси.

Тому Агіт.-просвіт відділ Генерального Комітету звертаеться до всих Украінських видавництв, громадских і політичних організацій з горичим закликом негайно надсилати до Агіт.-просвет. відділу комітету все, що вони можуть дати до даремного росповсюдження серед Украінців войскiв.

Надсиланни сеі лектури з'яздамидь улекшаць відділові систематичне роспреділення іі і приготування бібліотечок.

Громадяне Украінці! Памятайте, що автономія краю здобута організованим Українським військом у перших лавах!

Мобілізуйте всі опарати для освіти широкоі Украінськоі стихиі, не давайте ій вибиватись за береги розумних і потрібных іе[illegible]овинь!

Члени Агіт.-просвітнього відділу Генер. комітета. | Д. Ровинський, Е. Неронович, В. Варницький

Ахвяры

На фонд Бел. Нар. Партыі Сацыазістаў.

Ад Касяка 8 р. 50 к.
Ад Г. Асексюк за праданы у м. Радашковічах на прэдстаўленьні букет 91 р. 80 к.
Ад П. Алексюка за зробленую у г. Радашковічах, лётэрэю 106 р. 87 к.
Ад чл. парт. Л. Заяпа 100 р. — к.
Ад рожных асоб 260 р. 14 к.
Разам— 567 р. 34 к

Рэдактар Я. Лёсік

Выдавец: «Т-ва Беларускай Культуры.»

Друкарня Н. М. Пахумова. [старшага].